# «ПРАЙСЦІ ПРАЗ ВЕРНАСЦЬ»



Бягучы год выдаўся вельмі багатым на юбілейныя даты і падзеі. 17 верасня 2017 года споўнілася 105 гадоў з дня нараджэння знакамітага паэта XX стагоддзя, класіка беларускай літаратуры Максіма Танка (Яўгена Іванавіча Скурко). У сувязі з гэтай значнай падзеяй 4 кастрычніка народны літаратурны музей ВДУ імя П.М. Машэрава падрыхтаваў літаратурную імпрэзу «Прайсці праз вернасць», прысвечаную жыццёваму і творчаму шляху народнага паэта Беларусі.

Імя Максіма Танка назаўжды застанецца незгасальнай зоркай на небасхіле беларускай літаратуры. Нягледзячы на тое, што лёс не шкадаваў творцу і фарміраванне яго асобы адбывалася ў складаных умовах Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны, Максім Танк змог прайсці праз усе гэтыя выпрабаванні і захаваць у сабе лепшыя чалавечыя якасці. Ён застаўся верным сваёй Радзіме, сваім ідэалам і жыццёвым перакананням. Паэт-бунтар, паэт-патрыёт, паэт-сатырык, паэт-філосаф і паэт-наватар... А па жыцці надзвычай сціплы чалавек, які не любіў гучных слоў і бляску пражэктараў.

Літаратурная імпрэза аб'яднала ўсіх аматараў творчасці Максіма Танка. На сустрэчы была прадстаўлена прэзентацыя жыццёвага і творчага шляху паэта, гучалі вершы і песні ў выкананні студэнтаў філалагічнага факультэта. Тэматыка творчасці Максіма Танка вельмі разнастайная, у ёй прадстаўлены гістарычныя і філасофскія тэмы, тэмы кахання, любові да Радзімы і роднай мовы. На кожную з'яву ў жыцці гэты ўнікальны чалавек меў асабісты погляд, а самае галоўнае – не баяўся дзяліцца сваімі думкамі і меркаваннямі. Выдатна перадалі аўтарскі настрой чытальнікі: Ірына Данілава, Марк Цыганкоў, Ганна Чарняўская, Уладзіслаў Курыленка, Насця Бучкіна, Міхаіл Чэбаў, Вікторыя Гір'ятовіч, Насця Кісялёва, Ліза Яжгурава і аўтар дадзенага матэрыялу. Кранальна прагучала песня «Завушніцы» ў выкананні Сашы Казловай і Надзеі Радзеўскай. Асобна хацелася б адзначыць выставу кніг Максіма Танка, якую падрыхтавалі супрацоўнікі ўніверсітэцкай бібліятэкі.

Шаноўным госцем свята быў пляменнік Максіма Танка – Іван Фёдаравіч Скурко (сын роднага брата народнага паэта). Іван Фёдаравіч падзяліўся цікавымі і ўнікальнымі ўспамінамі пра свайго славутага дзядзьку, пазнаёміў усіх з матэрыяламі з уласнага архіва – арыгінальнымі выданнямі першых паэтычных зборнікаў: «На этапах», «Пад мачтай», «Вогненны небасхіл». Прысутныя мелі магчымасць на свае вочы пабачыць лісты і паштоўкі творцы, а таксама некаторыя дакументы дзядзькі Фадзея (брата бацькі Максіма Танка). Увогуле, атмасфера імпрэзы была вельмі цёплай і неафіцыйнай. Кожны ахвотны мог задаць пытанні госцю. У заключным слове старшы выкладчык кафедры літаратуры, загадчык народнага літаратурнага музея Ірына Вацлаваўна Саматой адзначыла, што ў жыцці і творчасці паэт прайшоў праз вернасць да Радзімы, бацькоў, сям'і, сяброў, мастацкай творчасці. Выконваючы высокую місію гераічнага змагання за свабоду і незалежнасць роднай Бацькаўшчыны, Максім Танк годна пражыў сваё жыццё і пакінуў пасля сябе шматлікія творы, якія з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай мудрасці для сучаснікаў і нашчадкаў.

**Юлія РУДЗЯКОВА,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**

**На здымку:** пляменнік Максіма Танка Іван Фёдаравіч Скурко і загадчык літаратурнага музея І.В. Саматой.

**Фота А. ДУБРОЎСКАЙ.**